ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1982
20
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 19 (1357)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

"Беларускі універсітэт"
мэлетаип
• Учора • Сёння • Заўтра •

У Маскве працягвае работу XIX з'езд ВЛКСМ

КАМСАМОЛЬЦЫ БДУ: АДНО ІМКНЕННЕ І МЭТА Ў НАС АДНА — ВУЧЫЦЦА, АДКРЫВАЦЬ І ПЕРАМАГАЦЬ, КАБ МАЛАДЗЕЛА НАША СЛАЎНАЯ КРАІНА!

ТЭЛЕГРАМА Ў АДРАС XIX З'ЕЗДА ВЛКСМ

Масква, Цэнтральны Камітэт Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі

Мы, камсамольцы старэйшай ВНУ рэспублікі, — Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, рапартуем вышэйшаму камсамольскаму форуму краіны, што дабіліся новых поспехаў у павышэнні працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў, выхаванні ў іх камуністычнай перакананасці, свядомай дысцыпліны, любві да сваёй прафесіі.

Усе намаганні мы накіроўваем на тое, каб паспяховай вучобай, ударнай працай, актыўным удзелам у грамадскім жыцці ўнесці свой уклад у выкананне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Кожны другі студэнт універсітэта займаецца на добра і выдатна, 500 юнакоў і дзяўчат узнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ і МінВНУ СССР «За выдатную вучобу».

З кожным годам расшыраецца гарызонт студэнцкай навукі. У навукова-даследчай рабоце ўдзельнічаюць звыш 7 тысяч студэнтаў. Толькі за 1981 год аб'ём работ, выкананых у СНДЛ, склаў 200 тысяч рублёў. 12 студэнтаў сталі сааўтарамі вынаходніцтваў.

За X пяцігодку маладыя вучоныя універсітэта ўдастоены 10 медалёў ВДНГ СССР і 34— ВДНГ БССР.

Бессмяротны подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне з'яўляецца для нас вялікім прыкладам служэння Савецкай Айчыне. Напярэдадні XIX з'езда ВЛКСМ адкрыты мемарыял партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава ў Уздзенскім раёне, узведзены студэнтамі-байцамі камуністычнага будаўнічага атрада універсітэта.

Ударнай справай камсамольскай арганізацыі стала шэфская работа. Камсамольцы універсітэта шэфствуюць над 8 прафтэхвучылішчамі, 28 гарадскімі і сельскімі школамі, 11 домакіраўніцтвамі, дзіцячым домам № 2.

Штогод школу працоўнага семестра праходзяць каля 3000 юнакоў і дзяўчат універсітэта. Толькі мінулым летам на будоўлях Беларусі, Карэліі, Якуціі, Нечарназем'я, Алтайскага краю, палях Малдавіі і Стаўраполля імі асвоена больш 4 млн. рублёў капіталаўкладанняў. Камсамольская арганізацыя універсітэта стала пераможцай абласнога і рэспубліканскага аглядаў-конкурсаў па падрыхтоўцы і арганізацыі работы СБА. Рады паведаміць, што трохтысячны студэнцкі атрад універсітэта гатоў да працоўнага семестра 1982 года.

Запэўніваем ЦК ВЛКСМ, што юнакі і дзяўчаты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна зробяць усё, каб кожны дзень XI пяцігодкі стаў днём паспяховай вучобы, ударнай працы, высокай грамадска-палітычнай актыўнасці.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

Я ШАГАЛ ЗА СЧАСТЛИВОЮ ДОЛЕЮ,
БЕСПОКОЙНЫМ ИСКАТЕЛЕМ СТАЛ.
О ЧУДЕСНОЙ СТРАНЕ КОМСОМОЛИИ
Я ЕЩЕ В ПИОНЕРАХ МЕЧТАЛ.
ТОЛЬКО ЛЮДИ С ЖЕЛЕЗНОЮ ВОЛЕЮ,
ТОЛЬКО ЛЮДИ С ОТКРЫТОЙ ДУШОЙ
НАСЕЛЯЮТ СТРАНУ КОМСОМОЛИЮ
И ЖИВУТ ЕЕ ЖИЗНЬЮ БОЛЬШОЙ.
Я МУЖАЛ, ЗАКАЛЯЛСЯ ВСЕ БОЛЕЕ,
ЗА ОТЧИЗНУ ГОТОВЫЙ В БОЙ.
ПОСТЕПЕННО СТРАНА КОМСОМОЛИЯ
ОТКРЫВАЛА МНЕ ТАЙНЫ СВОИ.
ВСЕ НАУКИ ПРОШЕЛ В ЭТОЙ ШКОЛЕ Я,
РЫЛ КАНАЛЫ И КАМНИ ТАСКАЛ
И НА СТРОЙКАХ ИСКАЛ КОМСОМОЛИЮ,
НА ЦЕЛИННЫХ ПРОСТОРАХ ИСКАЛ.
ШЕЛ ЗА НЕЮ ПО РУССКИМ РАЗДОЛИЯМ,
ШЕЛ С ДРУЗЬЯМИ НЕЛЕГКИМ ПУТЕМ
И НАШЕЛ Я СТРАНУ КОМСОМОЛИЮ
В НАШЕЙ ДРУЖБЕ И В СЕРДЦЕ СВОЕМ.

СТУДЭНЦКІЯ БУДАЎНІЧЫЯ

атрады універсітэта прынялі ўдзел у правядзенні тыдня СБА, арганізаванага Мінскім абкомам ЛКСМБ. Традыцыйны агляд гатоўнасці да працоўнага лета прысвячаецца сёлета 60-годдзю ўтварэння СССР і XIX з'езду ВЛКСМ. Насычаную праграму тыдня склалі: дзень прапаганды СБА «Нашы будоўлі — радкі ў біяграфію краіны», дзень агітацыйна-масавай работы «Веды і энтузіязм — Радзіме!», дзень тэхнікі бяспекі «Ад тэхнікі бяспекі — да бяспечнай працы», дзень ударнай працы «Будатрад на маршы пяцігодкі», дзень славы герояў «З героямі сэрца звяраючы», камсамольскі сход «З імем Леніна, пад кіраўніцтвам партыі— на працу і подзвіг!», дзень спорту «Усім атрадам — на стадыён».

У. ПУЗІКАЎ,
камісар Наваржэўскага занальнага штаба.

ПЕРШЫ ВЫПУСК

насценгазеты «Позірк у мінулае» навукова-даследчага гуртка па гісторыі БССР, які падрыхтаваны студэнтамі гістарычнага факультэта, падрабязна знаёміць чытачоў з праграмай работы па вывучэнню гарадоў і вёсак роднага краю, шматлікіх пытанняў сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў той ці іншы гістарычны перыяд. Акрамя таго, у нумары змешчаны цікавыя даследаванні і гістарычныя звесткі.

С. ДАРАШЭНКА.

СА СПЕКТАКЛЕМ

па п'есе Б. Ласкіна «Акселераты» перад студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта выступілі па запрашэнню камітэта камсамола і прафкома БДУ акцёры Калінінградскага абласнога драматычнага тэатра, які зараз знаходзіцца на гастролях у Мінску. Гледачоў зацікавілі блізкія ім праблемы школьнага і студэнцкага жыцця, узнятыя ў п'есе.

Н. ТУРОМША,
намеснік старшыні прафкома.

ЛАГЕР ПРАЦЫ

і адпачынку прафсаюзных актывістаў, як і ў мінулым годзе, будзе сёлета створаны ў Гурзуфе на ўзбярэжжы Чорнага мора. За тры змены ў ім змогуць адпачыць і папрацаваць больш за 200 студэнтаў універсітэта.

Р. МАРЧУК,
старшыня прэс-цэнтра прафкома.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі А. Г. Слука абмяркоўвае са студэнтамі матэрыялы XIX з'езда ВЛКСМ.

НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ

У КАЛЕКТЫВЕ універсітэта з вялікім уздымам прайшлі перадвыбарныя сходы па вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў.

Кандыдатамі ў дэпутаты Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў вылучаны прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню Уладзімір Сяргеевіч Багданаў і студэнтка III курса аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Тацяна Уладзіміраўна Буркун.

Кандыдатамі ў дэпутаты Маскоўскага раённага Савета народных дэпутатаў вылучаны сакратар парткома універсітэта дацэнт Міхаіл Герасімавіч Елісееў, студэнтка геаграфічнага факультэта Ірына Раландаўна Лапыр, студэнтка механіка-матэматычнага факультэта Алена Артураўна Такарская, дацэнт фізічнага факультэта Ала Станіславаўна Каспяровіч.

На сходах была выказана аднадушная думка, што названыя кандыдаты ў дэпутаты з гонарам апраўдаюць аказанае ім давер'е.

Наш кар.

● ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ

У ЧЕСНЫМ КАНТАКЦЕ

Закончыліся справаздачы і выбары ў партыйных групах універсітэта. У разгары справаздачна-выбарная кампанія ў партыйных арганізацыях факультэтаў і іншых падраздзяленняў. Сёння рэдакцыя прапануе матэрыял са справаздачна-выбарнага сходу НДІ ФХП і хімічнага факультэта.

Парадак дня справаздачна-выбарных партыйных сходаў тыповы: справаздача аб рабоце партыйнага бюро, справаздача камісіі па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, выбары партыйнага бюро, выбары камісіі па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі. Але, нягледзячы на аднатыпнасць праграм такіх сходаў, на дзелавую і канкрэтную абстаноўку, якая заўсёды спрыяе справаздачам і выбарам, атмасфера на кожным з іх свая ўласная, і праблемы, якія тут узнімаюцца, блізкія кожнаму.

— Адной з галоўных задач нашай партыйнай арганізацыі,—адзначыў у справаздачным дакладзе сакратар партбюро, дацэнт кафедры аналітычнай хіміі Л. М. Аўсянка,— з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў для патрэб народнай гаспадаркі, паспяховае выкананне навукова-даследчых работ на ўзроўні вынаходніцтваў і адкрыццяў.

Дастатковую ўвагу ўдзяляла партыйнае бюро пытанням вытворчай, вучэбнай і навукова-даследчай работы. На парадак дня партыйных сходаў, пасяджэнняў партбюро былі вынесены пытанні работы кафедр факультэта, лабараторый інстытута, заслухоўваліся вынікі сесій, арганізацыі і выкананне сацыялістычных абавязацельстваў і г. д. Праводзіліся нарады з камсамольскім актывам, абмяркоўваліся вынікі трэцяга працоўнага семестра.

Вучэбная работа пастаянна была ў цэнтры нашай увагі. За апошнія 6 гадоў абсалютная паспяховасць на факультэце ўзрасла з 92,7 працэнта да 96,1 працэнта. Павялічылася колькасць студэнтаў, якія маюць добрую і выдатную пасяховасць. Разам з тым належыць адзначыць нізкі сярэдні бал па спецыяльных прадметах навучання. Неабходна прыняць меры па паляпшэнню арганізацыі дзейснага кантролю за самастойнай работай, студэнтаў, неабходна сістэматычна прывіваць студэнтам навыкі работы над вучэбным матэрыялам, асабліва ўзмацніць якасць падрыхтоўкі будучых педагогаў.

Вынікам работы факультэта з'яўляецца выпуск спецыялістаў. Рэзультаты дзяржэкзаменаў і абароны дыпломных работ нас радуюць. 100 працэнтаў выпускнікоў дзённага аддзялення і 95,4 працэнта вячэрняга аддзялення ў 1981 годзе абаранілі дыпломныя работы на выдатна і добра. З году ў год павялічваецца колькасць работ, выкананых у НДІ і на вытворчасці, рэкамендаваных да друку і ўкаранення. Так, у 1981 годзе 54 работы рэкамендаваны да ўкаранення і публікацыі, эканамічны эфект ад укаранення дыпломных работ арыенціровачна склаў больш 500 тысяч рублёў.

З мэтай удасканалення прафесіянальнай падрыхтоўкі і размеркавання маладых спецыялістаў дэканат факультэта дасканала вывучае патрэбы міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў рэспублікі ў спецыялістах-хіміках. У адпаведнасці з канкрэтнымі патрабаваннямі вытворчасці адбываецца карэляцыя спецыяльных курсаў хімічных дысцыплін. У мінулым годзе ўведзены шэраг спецкурсаў.

У цяперашні час заключаны дагаворы аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з шэрагам міністэрстваў, якія прадугледжваюць некалькі асноўных пытанняў: падрыхтоўка маладых спецыялістаў для патрэб вытворчасці, расшырэнне баз вытворчай практыкі, выкананне дыпломных работ на вытворчасці, стварэнне новых спецкурсаў, максімальна набліжаных па сваёй праграме да канкрэтных вытворчых пытанняў, выкананне НДР.

Аднак, як паказала практыка размеркавання выпускнікоў у гэтым годзе, эфектыўнасць такіх дагавораў недастатковая. Дэканату, кафедрам, новаму саставу партбюро належыць дэталёва прааналізаваць такую форму работы. Тут неабходна ісці па шляху стварэння вучэбна-навуковых вытворчых аб'яднанняў з буйнейшымі прадпрыемствамі Беларусі.

Наш факультэт і інстытут забяспечаны высокакваліфікаванымі навуковымі кадрамі: 9 прафесараў, больш за 100 кандыдатаў навук. Выкананне плана навукова-даследчых і гасдагаворных работ не выклікала асаблівых трывог у партыйнага бюро.

Да правядзення навукова-даследчай работы на факультэце і ў інстытуце прыцягваюцца студэнты. Работа студэнцкага навуковага таварыства на факультэце пастаўлена нядрэнна. Разам з тым нельга лічыць нармальным, што шэраг высокакваліфікаваных супрацоўнікаў і выкладчыкаў інстытута не кіруюць навуковай работай студэнтаў.

Новаму саставу партбюро належыць звярнуць увагу на работу СНТ, савета маладых вучоных і ўзаемадзеянне яго з СНТ. У справаздачным годзе партбюро недастаткова ўдзяляла ўвагі гэтаму пытанню.

Без аналізу работы камітэта камсамола нельга ўявіць работу на факультэце і ў інстытуце. Уласна, гэта і ёсць адна з галоўных задач партыйнай арганізацыі ВНУ — выхаванне студэнцкай моладзі. На пасяджэннях партыйнага бюро неаднаразова заслухоўваліся пытанні аб рабоце камсамольскай арганізацыі, аб фарміраванні СБА, падрыхтоўцы і правядзенню Ленінскага заліку і ГПА, аб аналізе вынікаў ГПА, аб рабоце камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў. Прымаліся канкрэтныя рашэнні. Работа камітэта камсамола па павышэнню і выпрацоўцы актыўнай жыццёвай пазіцыі ў камсамольцаў пастаянна каардынавалася з партыйным бюро. Разам з тым работу з камсамолам, нашай зменай, трэба праводзіць больш планамерна.

Новаму саставу партбюро трэба яшчэ раз прааналізаваць работу камітэта камсамола і аказаць яму дзейсную дапамогу.

Далей выступаючы падрабязна спыніўся на дасягненнях у ваенна-патрыятычнай рабоце на факультэце, расказаў аб праблемах, якія існуюць у плане культурнага, мастацкага і маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў, прааналізаваў стан факультэцкай наглядной агітацыі і насценнага друку.

Адзначалася, што за справаздачны перыяд праведзена 10 партыйных сходаў, у падрыхтоўцы якіх прымалі ўдзел 63 камуністы, праведзена 21 пасяджэнне партыйнага бюро.

Лепшай з пярвічных груп у дакладзе была названа партыйная група НДІ ФХП.

Справаздача сакратара партыйнай арганізацыі, як бачым, насіла канкрэтна-дзелавы, самакрытычны характар. Гэта было адзначана выступіўшымі ў спрэчках. Слушныя прапановы камуністаў сведчаць аб глыбокай зацікаўленасці прысутных справамі факультэта і інстытута, аб імкненні кожнага палепшыць справу падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў з універсітэцкім дыпломам.

Канкрэтныя прапановы па паляпшэнню правядзення грамадска-палітычнай практыкі ўнёс старэйшы камуніст факультэта Ф. Ф. Церашонак.

— Трэба вучыць студэнтаў уменню весці актыўную ідэалагічную работу сярод насельніцтва. Гэта галоўнае ў ГПП,— адзначыў ён.

— Мы рэгулярна заслухоўваем на сходах справаздачы выкладчыкаў-камуністаў аб правядзенні імі вучэбна-выхаваўчай работы, што павялічвае адказнасць за якасць падрыхтоўкі будучых спецыялістаў,— гаварыла партгрупорг кафедры хіміі высокамалекулярных злучэнняў дацэнт Г. М. Паўлючэнка.

Аб рабоце добраахвотнай народнай дружыны факультэта расказаў в. а. загадчыка кафедры радыяцыйнай хіміі В. І. Гергалаў. Ён выказаў пажаданне аб прыцягненні да работы ў ДНД большай колькасці членаў КПСС.

Крытычныя заўвагі аб недакладна наладжанай галоснасці, прапановы аб больш канкрэтным інфармаванні камуністаў пра выкананне раней прынятых рашэнняў, аб іх больш дзейсным кантролі прагучалі ў выступленнях М. Г. Ніконенкі, партгрупорга кафедры радыяцыйнай хіміі і старшага інжынера па ахове працы і тэхніцы бяспекі НДІ ФХП У. І. Бандурына.

Намеснік сакратара партыйнага камітэта універсітэта П. Л. Салаў, які прысутнічаў на сходзе, адзначыў, што партыйная арганізацыя хімфака займае адно з лепшых месц ва універсітэце. Ён заклікаў камуністаў факультэта паляпшаць арганізацыю сацыялістычнага спаборніцтва і дабівацца ў гэтай справе добрых вынікаў. Звярнуў увагу на стварэнне ў калектыве спрыяльнага мікраклімату.

Кожны з пунктаў пастановы, прынятай справаздачна-выбарным сходам камуністаў хімічнага факультэта і НДІ ФХП, увабраў у сябе ўсё лепшае з багатага вопыту, назапашанага партыйнай арганізацыяй падраздзялення за мінулыя гады. Былі ўлічаны ўсе выказаныя прапановы і заўвагі. У састаў партыйнага бюро факультэта і інстытута ўвайшло 13 камуністаў. Сакратаром выбрана дацэнт кафедры хіміі высокамалекулярных злучэнняў і калоіднай хіміі Валянціна Міхайлаўна Сідэрка.

Т. АЛЯКСАНДРАВА.

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ГАРСАВЕТА

— Таня наша ўсюды паспявае, — гавораць яе сяброўкі.

— Грамадская работа мяне не стамляе, — усміхаецца Таня. — Я прывыкла да такога жыцця і не ўяўляю, што можа быць інакш. Я яшчэ са школы «хаджу ў актывістах». Была старшынёй савета дружыны, старастай класа, камсоргам...

Скончыўшы школу, Таня Буркун вырашыла паступаць на філфак БДУ імя У. І. Леніна. Першы год не паступіла. Пайшла працаваць на таварную станцыю ў Мінску, рыхтавалася да ўступных экзаменаў. Але зноў не пашанцавала. Так працягвалася чатыры гады, але яна не здавалася, упарта працавала. І вось, нарэшце, дабілася сваёй мэты: Таню залічылі студэнткай філалагічнага факультэта аддзялення беларускай і рускай мовы і літаратуры.

Успамінае першую студэнцкую восень на уборцы бульбы... Яе тады выбралі камісарам атрада. На другім курсе была камандзірам педатрада ў Хатлянскай сярэдняй школе Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.

Зараз Таня вучыцца на III курсе. Яна адказная за шэфскі сектар на філфаку. Калі пасля новага года пачалі фарміраваць будаўнічыя атрады, ёй прапанавалі ўзначаліць адзін з лепшых СБА філфака—«Мара».

— А як вучыцца Таня! — цікаўлюся я. — Ці хапае ў яе часу для захаплення?

— На добра і выдатна,— гаворыць яе сяброўка Маша Бажко. — Зімовую сесію здала толькі на выдатна. Атрымлівае стыпендыю імя Якуба Коласа. А інтарэсы ў яе вельмі разнастайныя: захапляецца паэзіяй, прозай, любіць музыку.

Л. КАМАІШКА,
студэнтка філфака.

З НАШАЙ ПОШТЫ

ДАРОЖКІ НА БЕЛЫМ АРКУШЫ

АЎТОРАК — жаданы дзень для студэнтаў нашай групы. Падымаюся на трэці паверх і хуценька накіроўваюся да 39-й аўдыторыі, адкуль чуецца характэрнае «тук-тук-тук»...

На маё прывітанне ніхто не адказвае. Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Па-першае, з-за рытмічнага стуку, які вельмі нагадвае пазыўныя азбукі Морзэ,—нічога не чуваць. Па-другое, студэнты так заняты справай, так стараюцца, што нічога не заўважаюць. У Вадзіма Караневіча нават лоб узмакрэў. Ён выконвае сёмае заданне, а яно нялёгкае. «Тук-тук-тук» — і па белым аркушы паперы пабегла чорная дарожка: «Мінск — горад-герой».

Таня Гасціловіч скончыла работу, задаволена ўсміхнулася і аддала свой аркуш Але Уладзіміраўне Кондрусевай, якая вядзе ў першакурснікаў машынапіс. Заўсёды дапамажа яна наладзіць машынку, растлумачыць усё незразумелае. Паглядзела на работу Тані і без адзінай заўвагі вывела ў журнале жаданую пяцёрку.

Я выбрала ўтульнае месца ля акна, адкрыла крышку—і пабегла чорная стужка. Вось яна, апошняя кропка. Ура! Заданне выканана, і ніводнай памылкі! Адрываю позірк і толькі цяпер заўважаю, што каля мяне паявілася суседка—Святлана Вяроха. Света засяроджана глядзіць на аркуш, на якім я паспела прачытаць: «Добры дзень...»

Дзіўна, калі Света паспела выканаць заданне і прыняцца за ліст дамоў.

— Хай паглядзяць, як я ўжо навучылася друкаваць...

Мы, першакурснікі факультэта журналістыкі, добра разумеем, што рэдакцыі газет, часопісаў, радыё і тэлебачання чакаюць людзей вопытных, якія валодаюць не толькі словам, але могуць тэхнічна афарміць любую работу. І магчыма таму мае аднакурснікі старанна і настойліва авалодваюць справай машынапісу.

Н. БАБКО,
студэнтка журфака.

НА КРЫЛАХ ТРАДЫЦЫЙ

— Я ж дзяўчына Алеся. Няўжо ты мяне не пазнаеш?

— Тая, што з Палесся?

— Няхай будзе з Палесся,— чую гаворку побач.

Дзяўчына з доўгай бялёсай касой і ружовым вянком на галаве, з пявучым голасам — нібы сышла са старонак беларускіх апавяданняў, песень, вершаў. Апынуўшыся тут, у дзелавой абстаноўцы камітэта камсамола філфака, яна быццам здзіўлялася: «Чаму гэта на мяне не звяртаюць увагі? Я ж тут галоўная... Я ж прыгажуня... Якое свята на філфаку без мяне?»

Не, апошняга яна не прамовіла ўслых: яна моўчкі ўваходзіла ў ролю... А можа гэта і была сапраўдная Алеся?

Прыбеглі дзяўчаты ў цёмназялёных будатрадаўскіх формах, усхваляваныя, заклапочаныя:

— Мы ж вёдраў не ўзялі, чаму нам ніхто не сказаў пра вёдры? Дзе мы іх цяпер знойдзем?

З самай раніцы на філфаку ажыўленне. Праз паўгадзіны — урачыстае шэсце па вуліцы Карла Маркса, а потым — электрычкай у Вязынку, дзе адбудзецца традыцыйны злёт філолагаў рэспублікі. Сама па сабе традыцыя ўжо даўно зрабілася сапраўдным святам для студэнтаў. Бо гэта заўсёды свята, калі падводзяцца вынікі работы (а ганарыцца ёсць чым), дэманструюцца дасягненні, калі сустракаюцца калегі розных ВНУ рэспублікі, калі гучаць новыя вершы вядомых паэтаў. А ў гэтым годзе свята ў Вязынцы — двайное: злёт філолагаў прысвечаны 60-годдзю ўтварэння СССР і 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа.

У вагоне электрычкі, дзе едуць дзяўчаты будатрада «Мара», шумна і весела.

Стучат колеса где-то,
Расстались мы с тобой,—

спяваюць дзяўчаты пад гітару...

Таня Буркун, камандзір «Мары», сядзіць насупраць, канстатуе:

— Як заўсёды, ва Уладзіміраўку паедзем. Гэта Слабадзейскі раён Малдавіі. Атраду дзевяць гадоў. З мінулага лета ён стаў інтэрнацыянальным. Камандзірам еду першы раз:

— Счастлив, кому
знакомо,
Щемящее чувство
дороги...

Вось і Вязынка. Сапраўды цудоўныя, непаўторныя мясціны, адзін з самых прыгожых куткоў Беларусі. Вунь, за ўзгоркам, на беразе рачулкі, ужо расстаўлены палаткі.

Камандзіры будатрадаў здаюць рапарты.

Слова бярэ дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк. Пасля яго выступаюць загадчыца кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова, сакратар парткома універсітэта М. Г. Елісееў, паэты Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін. Шмат цёплых слоў яны гавораць у адрас філфака, яго традыцый.

— Купала, Колас і моладзь, юнацтва — гэта самыя дакладныя, самыя яскравыя сінонімы, — сказаў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР прафесар Н. С. Гілевіч.— У моладзі вялікія змагары за народнае шчасце бачылі будучае нашай краіны, наш з вамі сённяшні дзень...

Насычаная праграма злёту: тут і працоўны дэсант — байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў працуюць на добраўпарадкаванні тэрыторыі музея, і конкурсы на лепшае афармленне палаткі, на лепшую насценгазету, на лепшы веснавы букет, канцэрт на летняй эстрадзе, літаратурная віктарына...

Прадстаўнікі кожнага атрада нясуць гірлянду да помніка Янкі Купалы. Там пачынаецца традыцыйны час паэзіі — фестываль паэтаў аб'яднання «Узлёт», якім кіруе прафесар А. А. Лойка.

...К вечару ўсе збіраюцца ля кастра. І зноў гучаць над лугам песні...

А. ЛЫСЮК,
В. ШАЧАК (фота).

...Урачыстая лінейка. Злёт адкрывае сакратар камітэта камсамола філфака Таццяна Сотчанка.

СЭРЦУ ЛЮБЫ, УНІВЕРСІТЭТ

У НАШАЙ ДРУЖНАЙ студэнцкай сям'і ёсць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей СССР. Сыны і дочкі Поўначы, Далёкага Усходу, Крыма, Каўказа, Сібіры прыязджаюць у Мінск. І перад імі гасцінна адкрывае дзверы Беларускі дзяржаўны універсітэт. Што ж прыводзіць сюды гэтых рабят?

— Я даўно марыла стаць журналісткай, супрацоўнічала ў газеце ў сваім родным горадзе Клінцы, што на Браншчыне. Бліжэйшай навучальнай установай, дзе я магла атрымаць спецыяльную адукацыю, быў універсітэт у Мінску. Так я стала абітурыенткай, а пасля і студэнткай БДУ, — гаворыць Ірына Аронава, студэнтка I курса факультэта журналістыкі.

Адразу ж Ірына сутыкнулася з некаторымі асаблівасцямі навучання. Дзяўчына не ведала беларускай мовы.

— Прыйшлося пачынаць з нуля. Я вучылася ўспрымаць мову на слых. Аказалася, што не цяжка ўлавіць сэнс некаторых слоў. Калі што было незразумела, пыталася ў сваіх аднакурснікаў. Восенню мы працавалі ў калгасе на Магілёўшчыне. Там я атрымала першыя ўрокі па беларускай арфаэпіі, а маім «настаўнікам» быў Ігар Ганчарук.

Алёна Маскаленка:

— Вучыцца ва універсітэце мне вельмі падабаецца. Цікавыя тут людзі, кожны дзень насычаны нечым новым. Стаў блізкім для мяне і горад-прыгажун Мінск, хоць вельмі часта ўспамінаю родны Херсон, такі далёкі і блізкі. Недзе за сінімі рэкамі, зялёнымі гаямі квітнее мая Украіна.

Сёння на першым курсе журфака займаецца нямала студэнтаў, якія прыехалі да нас здалёк. Напрыклад, Каця Булычова — карэнная масквічка, Іна Кашыцкая нарадзілася і выраслa ў сонечнай Феадосіі. Розныя шляхі прывялі іх ва універсітэт, але мэта была адна — набыць трывалыя веды і прафесіянальныя навыкі.

І так на кожным факультэце. Моладзь, якая прыязджае з усіх куткоў Краіны Саветаў, знаходзіць верных сяброў, бо БДУ — гэта маленькі кавалачак таго, што завецца велічным, узнёслым словам Радзіма.

А. ГРЫШКЕВІЧ,
студэнтка журфака.

Эстонская ССР: роўная сярод роўных

Штогод Дзяржаўны мастацкі інстытут у Таліне выпускае шмат маладых таленавітых людзей з вышэйшай мастацкай адукацыяй. У цяперашні час тут навучаюцца 524 чалавекі. Гэта дружная шматнацыянальная сям'я: сярод студэнтаў інстытута — прадстаўнікі ўсіх саюзных рэспублік, а таксама шмат моладзі з замежных краін.

На факультэце выяўленчага і прыкладнога мастацтва юнакі і дзяўчаты навучаюцца скульптуры, графіцы, жывапісу, кераміцы, мастацкай апрацоўцы шкла, металу і скуры, а на факультэце архітэктуры займаюцца будучыя дызайнеры, мастакі інтэр'ера і архітэктары.

НА ЗДЫМКУ: рэктар Дзяржаўнага мастацкага інстытута ЭССР прафесар Яан Варэс (у цэнтры) сярод студэнтаў. Злева направа — літоўка Эгле Заромскайтэ, армянін Рафаэль Даніелянц, малдаванін Леанід Ватнік, паляк Уладзіслаў Міцкевіч, эстонка Анне Касемаа.

Фота **П. Вяндзеліна.**

СПОРТ

На фінішы спартакіяды

З ТАГО ЧАСУ, калі быў падняты флаг XXX спартакіяды універсітэта, прайшло звыш 7 месяцаў. Засталося правесці спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы, спартыўнаму арыентаванню, лёгкай атлетыцы, вясенняму кросу, цяжкай атлетыцы і веласпорту.

Красавік быў насычаны захапляючымі стартамі. Завяршыліся першынствы універсітэта па шашках, настольнаму тэнісу, плаванню, фехтаванню, футболу, вольнай барацьбе, мнагабор'ю ГПА, спартыўнай гімнастыцы.

Асаблівую цікавасць выклікаў настольны тэніс. Але, на жаль, у турніры ўдзельнічала ўсяго 8 каманд. Меркавалася, што асноўная барацьба за перамогу будзе весціся паміж юрфакам, ФПМ, хімфакам і журфакам, якія ў мінулым годзе склалі фінальную групу. Каманда юрфака паказала даволі слабую гульню. Тэнісісты журфака ў турніры не ўдзельнічалі, а хімфак хоць і прабіўся ў фінал, але там усе матчы прайграў і заняў чацвёртае месца. На трэцяе выйшлі тэнісісты факультэта радыёфізікі і электронікі. Барацьба за першае месца разгарнулася паміж камандамі мехмата і ФПМ. Леташні чэмпіён — каманда ФПМ — перамог і адстаяў высокае званне.

На пятым месцы гістфак, шостае занялі студэнты біяфака.

Для юрыстаў гэта важкая няўдача. Яны — прэтэндэнты на першае месца ў спартакіядзе. І паспяховае выступленне каманды ФПМ, якая па цяперашніх разліках ідзе другой, абвастрыла барацьбу за першынство ў спартакіядзе.

Юрфак крыху паправіў свае справы, выйграўшы турнір па вольнай барацьбе.

У мнагабор'і ГПА перамаглі спартсмены механіка-матэматычнага факультэта. Другое месца занялі мнагаборцы ФПМ. Трэцяе месца заваяваў філалагічны факультэт, што, безумоўна, з'яўляецца поспехам каманды.

Першынство па мнагабор'ю ГПА можна прывесці ўзорам добрай арганізацыі спаборніцтваў. Старты па шасці відах праведзены за два дні.

А вось у спаборніцтвах фехтавальшчыкаў пераможцамі ў асабістым заліку сталі А. Мядзведзеў (ФПМ) — шпага, В. Мядзведзеў (ФПМ) — рапіра, Я. Абрамаў (хімфак) — шабля. У дзяўчат па рапіры першае месца заняла студэнтка гістфака І. Семанкова.

У камандным заліку перамаглі спартсмены мехмата.

Як бачым, красавік быў празмерна перагружаны спартыўнымі спаборніцтвамі. А гэта не вельмі добра, бо спаборніцтвы па футболу намячалася закончыць у кастрычніку, па настольнаму тэнісу і шашках— у сакавіку, па вольнай барацьбе — у лістападзе, па плаванню — у снежні, а фехтаванне павінна было прайсці ў лістападзе—снежні. Гэта з'яўляецца парушэннем палажэння і праграмы спартакіяды. І арганізацыйнаму камітэту варта падумаць, каб такое не паўтарылася ў будучым.

С. ШАЎЦОЎ,
І. УЛАДЗІМІРАЎ.

* * *

ШАШКІ

ЗМЕНА ЧЭМПІЁНА

ТАК ЗДАРЫЛАСЯ, што рашаючы матч на першынстве універсітэта па шашках адбыўся ўжо ў трэцім туры. Чэмпіёны мінулага года — шашысты фізічнага факультэта — сустракаліся з моцнай камандай факультэта прыкладной матэматыкі. Чакалася напружаная барацьба. Але да сустрэчы лепш падрыхтаваліся спартсмены ФПМ, якія перамаглі з лікам 5,5 : 1,5.

Пасля гэтага шлях да чэмпіёнскага тытула камандзе ФПМ быў адкрыты. Толькі факультэт журналістыкі ў сустрэчы з лідэрам праявіў упартасць. Так, упартасць, бо ўзровень гульні журфакаўцаў значна ніжэйшы, чым у спартсменаў ФПМ. Але няпоўны састаў каманды (пяць чалавек з сямі) забраў тры ачкі. Безраздзельнікі перамаглі кандыдатаў у майстры спорту. І невядома, чым бы закончыўся гэты матч, калі б журфак быў у поўным саставе.

А на другім месцы застаўся фізфак. У параўнанні з мінулым годам шашысты факультэта выглядалі значна слабей, ды і дысцыпліна была значна слабейшая.

Лідэр каманды фізфака майстар спорту СССР Г. І. Пятровіч выйшаў пераможцам на першай дошцы, набраўшы 8 ачкоў. Прыемна было глядзець, як выкладчык хварэў душой і справай за факультэт, радаваўся за поспех, перажываў за няўдачы. Добра, што ёсць такія людзі ў камандзе!

На другім месцы ў сустрэчы лідэраў быў кандыдат ў майстры спорту СССР М. Г. Рафальскі, супрацоўнік хімфака. А трэцяе месца ў майстра спорту СССР І. В. Беляеўскага, супрацоўніка ФПМ, які правёў не ўсе гульні.

Юрыдычны факультэт хоць і заняў трэцяе месца, але не раскрыў свае магчымасці поўнасцю. Толькі буйны поспех у двух апошніх турах дазволіў камандзе ўвайсці у тройку прызёраў.

Каторы ўжо год ідзе размова аб прысваенні спартыўных разрадаў па выніках першынства універсітэта. Суддзя турніру Н. Рачкоўская падала спісы студэнтаў аб прысваенні ім разрадаў. Але ці будуць выдадзены ім пасведчанні?

У. АБРАМОВІЧ.

КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР

Пяро—прылада варварства?

ЦІ ДАВОДЗІЛАСЯ вам бачыць цудоўныя фрэскі, пакрытыя шматгадовымі варварскімі наслаеннямі розных эпох і народаў? Калі не—то прыходзьце да нас, на юрфак, убачыце нешта падобнае.

Не спяшайцеся сцвярджаць, што гэта звычайныя аўдыторныя парты, за якой студэнты вышэйшай навучальнай установы ўспрымаюць «разумнае, добрае, вечнае». Фрэсак і сапраўды няма, а вось варварства хапае. Нашы парты змогуць хутка прэтэндаваць на ролю ВПЭ (Вялікай Партавай Энцыклапедыі). Не верыце? Калі ласка, пройдзем у аўдыторыю № 1001. Хочаце ведаць усю шматлікасць фірм, якія выпускаюць джынсы? Няма нічога лягчэй! Другая парта ля акна, чытайце: усе, пачынаючы з шырока распаўсюджаных і заканчваючы дасягальнымі толькі ў сне.

На наступнай парце аматары жывёл усклікаюць: «Не чапайце сабак, не палохайце кошак!» А хтосьці і зусім, залічыўшы сябе ў атрад братоў нашых меншых, вінавата апраўдваецца: «Мы — не казлы! Казлы не мы!»

«Мысліцелі» адной «эпохі» не могуць жыць без дыялога з тымі, хто прыходзіць ім на змену, шукаюць сярод іх аднадумцаў і прадаўжальнікаў. Вось і паяўляюцца тады на свет пранікнёныя размовы накшталт гэтай: «Усе вялікія людзі паміралі рана. І мне штосьці нездаровіцца...»

Нярэдка чыёсьці гучнае імя засланяе думку «мысліцеля». Філасофскае выказванне губляецца дзесьці знізу, а над ім — нетаропкая размова, якая працягваецца часам месяцамі.

«...— Тут сяджу я!
— І я!
— А ты хто?
— Коля, а ты?..»

А цяпер дазвольце і на узяць слова. Навошта пісаць на партах тое, што можна сказаць! Мы звяртаемся да вашага сумлення, партапісцы! Навошта ператвараць пяро ў прыладу варварства?

У. СУХАВЕЙ,
С. КАРАБЦОВА,
Г. АНДРОНАВА,
І. ЖАЛУДОВА,
студэнты юрыдычнага факультэта.

ЗНАРОК НЕ ПРЫДУМАЕШ

У ходзе праверкі ўнутрысаюзнай работы ў камсамольскіх арганізацыях I і II курсаў членам штаба «КП» ФПМ давялося пазнаёміцца са зместам некаторых дзённікаў камсоргаў. Найбольш «цікавыя вытрымкі» з іх яны прапануюць вашай увазе, паважаныя чытачы:

«...Для дасягнення **больш высокіх адзнак** у зімовую сесію стварыць кансультацыйную групу...»

(I курс, 1-я група, пратакол № 3)

«...Пастанавілі: **прымацаваць** за групай **пачынаючай** групу **працягваючую англійскую мову...»**

(I курс, 2-я група, пратакол № 4)

«...Атэстуемыя адказвалі на пытанні **атэстуючай** камісіі. Пастанавілі: 1) паставіць **атэстуемым** наступныя адзнакі... 2) адсутнічаючых на сходзе **не атэставаць...»**

(II курс, 12-я група, пратакол № 11)

«...Так як асабістыя комплексныя планы **ўпаўне** адпавядаюць патрабаванням да іх, яны прымаюцца **амаль поўнасцю...»**

(I курс, 3-я група, пратакол № 1)

АД ЛІХТАРЫКА: чакаем паведамленняў з іншых факультэтаў. Прымаюцца вытрымкі толькі з афіцыйных дакументаў.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

20 мая 1982 г.

АТ 21286 Заказ 1006

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ